**В. Д. Фицкевич**

# ДА ПЫТАННЯ АБ ПЕРАЖЫТКАХ ЯЗЫЧНІЦТВА Ў КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСАЎ

На тэрыторыі сучаснай Беларусі перавалодаючай рэлігіяй з'яўляецца хрысціянства. Аднак, можна заўважыць і рэшткі язычніцтва, якія засталіся ў звычках беларусаў. Вядома, што хрысціянства не можа ісці поруч з паганствам, але ці змаглі беларусы знайсці "залатую сярэдзіну"? Натуральна, што ніякіх першакрыніц, якія сведчаць аб духоўным свеце селяніна той эпохі, няма. Таму варта звярнуцца да рэканструкцыі яго ўяўленняў праз збор інфармацыі ў жыхароў вёсак.

Свет, на думку старажытнага беларуса, дуальны, таму з самых простых існуючых з’яў можна заўважыць яўную супярэчлівасць: у адзін дзень чалавек можа казаць “дзякуй Богу”, “Божухна”, “Божа мой”, і прытым абавязкова знойдзецца чалавек, які тры разы пагрукае па дрэве або плюне праз плячо, што ёсць  перажытак язычніцкіх павераванняў. Феномен святаў у сучасных беларусаў, вельм і цікавы. Разам з адзначэннем Раства і Вялікадня абавязковыя і адзначэнні Масленіцы, Камаедзецы, Купалля і гэтак далей. Нават у адзначэнні Вялікадня ёсць свае цікавыя язычніцкія звычаі. Сярод апытаных людзей  ёсць частка, якая свенціць яйкі і кулічы (якія і без таго сыходзяць сваімі вобразамі да язычніцтва),а адходы ў выглядзе яічнай шкарлупы і паперы ад куліча адносяць на скрыжыванне, ад якога потым адыходзяць не азіраючыся. Нельга не адзначыць нагоду паста перад Вялікаднём і Раством. Цяпер толькі каля 35 адсоткаў ад апытаных людзей прытрымліваюцца яго перад святамі, тым часам як раней гэтай працэдурай займаліся ўсе. Было вясветлена, што гэта звязана наўпрост з запасамі ежы ў беларускай вёсцы: сканчэнні і з’яўленні мясных прадуктаў неверагодна выпадковым чынам супадалі з пастамі.

Акрамя таго нельга не адзначыць існаванне язычніцкіх абрадаў і ў тыя часы, і цяпер. Раней было прынята рознымі спосабамі варажыць на Раство (закідванне ботаў на забор, абдыманне забору, забегі вакол хаты, гаданне на свячах і кольцах). Як апынулася, маладыя людзі і зараз займаюцца гэтым, нягледзячы на актыўную хрысціянскую павестку, якая катэгарычна супраць дадзеных дзеянняў. Аднак, абрады перажылі трансфармацыю: праз урбанізацыю па большай частцы засталіся варажэнні ўнутры дома, такія як карты, свечы, вада і гэтак далей.

На нашую думку, нельга дакладна казаць, што цяпер беларусы поўнасцю перайшлі ў сваіх бытавых справах да хрысціянства, як і не засталіся з выключна язычніцкімі звычкамі. Але тым жа часам нельга сведчыць і пра абсалютную абыякавасць да дадзенага пытання. Сёння можна зрабіць вынік, што сучасны беларус жыве на памежжы двух светаў, якія дазваляюць быць бліжэй да продкаў і звыклага ладу жыцця.